Шыфр:____________________________

Колькасць балаў:__________________

Месца:_____________________

**Зацвярджаю**

**Намеснік старшыні арганізацыйнага камітэта намеснік Міністра адукацыі**

________________ **К.С. Фарыно**

«____»______________2012 года

ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXVIII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ ВУЧНЯЎ УСТАНОЎ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ, ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ І СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Магілёў, 2012 г.*

**11 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**1 варыянт**

**Заданне 1.** Выпішыце пары рускіх і беларускіх слоў, у якіх націск падае на розныя склады.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

***Узор:*** *зáячий – заéчы.*

Годовщина – гадавіна, грабеж – грабеж, губчатый – губчаты, дочиста – дачыста, засветло – завідна, индустрия – індустрыя, осока – асака.

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ:_____________________________________________________________

_____________________________________________________________________________

**Заданне 2.** Укажыце нумары характарыстык, уласцівых для навуковага стылю.

*Максімальная колькасць балаў - 4.*

| | |
|---|---|
| 1. | Сфера выкарыстання – навука і тэхніка; |
| 2. | дакладнасць; |
| 3. | наяўнасць аргументацыі; |
| 4. | наяўнасць канцылярызмаў; |
| 5. | асноўная функцыя – пабуджальная; |
| 6. | ужываецца размоўная лексіка; |
| 7. | аб'ектыўнасць. |

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ:_________________________________________________________

**Заданне 3.** Запішыце 5 назоўнікаў мужчынскага роду, якія ўтвораны пры дапамозе суфіксаў *-чык/-шчык* і маюць значэнне *'асобы паводле роду заняткаў, сацыяльнага стану'.*

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| №<br>п/п | Словы |
|---|---|
| 1. | |
| 2. | |
| 3. | |
| 4. | |
| 5. | |

**Заданне 4.** Устанавіце адпаведнасць паміж радамі слоў і мовамі, з якіх словы былі запазычаны. Запішыце правільны адказ.

*Максімальная колькасць балаў – 7.*

| | |
|---|---|
| **А.** Фасон, кларнет, гараж, гравюра, гурман | **1.** З грэчаскай мовы |
| **Б.** Нефрыт, карозія, каталог, нігілізм, папірус | **2.** З польскай мовы |
| **В.** Баскак, султан, шацёр, магарыч, чобат | **3.** З старaславянскай мовы |
| **Г.** Арфаграфія, эпіграма, аптэка, камета, космас | **4.** З лацінскай мовы |
| **Д.** Кавадла, кудлаты, рыдлёўка, гатунак, кабета | **5.** З нямецкай мовы |
| **Е.** Благі, дзесяціна, злак, храм, скрыжалі | **6.** З цюркскіх моў |
| **Ж.** Арышт, варта, шайба, штаб, дах | **7.** З французскай мовы |

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ:______________________________________________

**Заданне 5.** Прааналізуйце прыклады, раскрыйце і запішыце лексічныя значэнні фразеалагізма ***бабіна лета.***

*Максімальная колькасць балаў –4.*

1. За парканам спелі яблыкі і арабіны, пад парканам раскашэльвалася мята і ***бабіна лета***... (К. Чорны); 2. Ззяе ***бабінае лета*** І іскрыцца сівізною. Гэта першая прыкмета, Што зіма не за гарою (В. Шніп); 3. Згасла ***бабіна лета.*** Як касцёр на узлеску, Дагарэла асінка мядзяным агнём, І, нібы на кірмаш, Хмар вазы з-за паўсвету Коцяць, пыляць імжою, Драбнасейным дажджом (А. Руцкая); 4. У жыцці маім – ***бабіна лета***, на душы маёй – квецень вясны! (П. Пруднікаў)

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ:

БАБІНА ЛЕТА – **1.** ______________________________________________;
**2.** ______________________________________________; **3.** ______________
______________________________________________; **4.** ______________
______________________________________________.

**Заданне 6.** Запішыце, якому вядомаму лінгвісту прысвечаны прыведзены ніжэй нарыс. Якая з прац гэтага навукоўцы лічыцца «энцыклапедыяй беларусазнаўства»?

*Максімальная колькасць балаў –3 (2 + 1).*

Філолаг-славіст, заснавальнік беларускага мовазнаўства і літаратуразнаўства, этнограф, фалькларыст, палеограф. Аўтар прац па славістыцы, гісторыі беларускай мовы, дыялекталогіі, фальклоры, этнаграфіі, гісторыі беларускай літаратуры і інш.

На аснове глыбокага, комплекснага параўнальна-гістарычнага абагульнення фактычнага матэрыялу навукова абгрунтаваў нацыянальную самабытнасць беларусаў як самастойнага славянскага народа, які стварыў сваю багатую і арыгінальную культуру, мае старажытныя традыцыі.

Даследаваў паходжанне беларускага народа, акрэсліў яго этнічныя межы. Вызначыў час фарміравання беларускай народнасці, даў этнаграфічную карту Беларусі пач. XX ст.

Асвятліў важнейшыя этапы гісторыі беларускай мовы, яе спецыфічныя асаблівасці і ўзаемасувязі з рускай, украінскай, польскай, літоўскай і іншымі мовамі, вызначыў асноўны фонд

рукапісаў і помнікаў пісьменства беларускага паходжання. Абгрунтаваў вучэнне пра гукавы і граматычны лад старабеларускай і сучаснай беларускай мовы ў яе народна-дыялектнай і літаратурнай формах. Яго навуковая спадчына не страціла і сёння сваёй значнасці і з'яўляецца асновай для далейшай распрацоўкі беларусазнаўства.

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ:______________________________________________

______________________________________________

**Заданне 7.** Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Вызначце і запішыце струтурны тып складанага сказа. Прывядзіце схему сказа.

*Максімальная колькасць балаў – 8.*

***

Гляджу на ўсё ў радасным здзіўленні
Як ластаўка гняздо старанна лепіць
І як шчупак у затоне ломіць аер
Як дзед-садоўнік беліць ногі вішням
І песню пра Купаліньку пяе
Як на світанні зоры паміраюць
Каб нарадзіцца вечарамі зноў. (*П. Панчанка*)

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ:______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

**Заданне 8.** Вызначце, якім літаратуразнаўчым паняццям адпавядаюць наступныя азначэнні.

*Максімальная колькасць балаў - 3.*

А) Паэтычны троп, а таксама мастацкі прыём адлюстравання рэчаіснасці, які заключаецца ў парушэнні сапраўдных форм і памераў рэчаў, у спалучэнні рэальнага з фантастычным, трагічнага са смешным, у наўмысным перабольшанні ці змяншэнні з'яў рэчаіснасці.

**Правільны адказ:**______________________________________________

Б) Верш, у аснове рытму якога – чаргаванне вершаваных радкоў як аднатыпных інтанацыйна-сэнсавых адзінстваў. Надзвычай важнае значэнне набывае ў ім графічная разбіўка верша на радкі, вызначэнне месца міжрадковых паўз.

**Правільны адказ:**______________________________________________

В) Мастацкі метад і эстэтычны кірунак у еўрапейскім мастацтве і літаратуры XVII—пачатку XIX стст., аснову якога складалі прынцыпы рацыяналізму, "пераймання прыроды", зварот да антычнага мастацтва як да эстэтычнага эталона.

**Правільны адказ:**______________________________________________

**Заданне 9.** Вызначце, хто з пералічаных беларускіх пісьменнікаў з'яўляецца аўтарам прыведзенага верша. Выбар абгрунтуйце.

*Максімальная колькасць балаў – 4 (2 – за правільны адказ, 2 – за абгрунтаванне)*

Бурты кладуцца, як барханы.
Лапатам не даём астыць.
Ды што за шум?..
Прыйшлі лісты.
Лісты ад родных, ад каханых.

І мне ж тут нешта быць павінна...
Матулін почырк пазнаю.
І піша пра бяду сваю,
Пра радасць і пра ўсе навіны:

«Сусед наш справіў наваселле.
Ну, а ў бары па верасу
Грыбоў – хоць закладай касу,
І ўжо арэхі палыселі...

Вуголле з печы ўранні скача,
Кот мыцца на акне пачне. -
І верыцца, што ты ка мне
Паспееш па пірог гарачы».

Я сёмы раз, забыўшы стому,
Чытаю гэты ліст.
нібы
Я на Ушаччыне пабыў,
Пагутарыў з усімі дома...

І зноўку зерне з-пад лапаты
Уверх ляціць ва ўсе бакі
І падае. (А так шпакі
На луг садзяцца там, за хатай...)

А) Янка Купала
Б) Цётка
В) Якуб Колас
Г) Максім Багдановіч
Д) Максім Танк
Е) Рыгор Барадулін

**Абгрунтаванне:** ______________________________

**Заданне 10.** Ніжэй прыводзіцца арыгінальны тэкст класічнай рускай літаратуры і яго пераклад на беларускую мову. У асобных радках перакладу зробленыя пропускі. Пастарайцеся ўзнавіць версію перакладчыка і / або прапанаваць уласную. Пры стварэнні ўласнага варыянта (варыянтаў) дазваляецца поўнасцю змяняць радок, у якім ёсць пропуск, галоўнае – захаваць мастацкую цэласнасць твора

*Максімальная колькасць балаў - 8 (па 2 балы за кожны адпаведны варыянт).*

| | |
|---|---|
| Клён ты мой опавший, клён заледенелый,<br>Что стоишь, нагнувшись, под метелью белой? | Клён ты мой апалы, клён заледзянелы,<br>Што стаіш, сагнуты, ________________? |
| Или что увидел? Или что услышал?<br>Словно за деревню погулять ты вышел. | І ці што убачыў? Ці пачуў у цішы?<br>Быццам бы за вёску прагулянца выйшаў. |
| И, как пьяный сторож, выйдя на дорогу,<br>Утонул в сугробе, приморозил ногу. | І, нібыта п'яны, пры глухой дарозе<br>Ты нагу цяжкую ў гурбе прымарозіў. |
| Ах, и сам я нынче чтой-то стал нестойкий,<br>Не дойду до дома с дружеской попойки. | Што са мною стала, сёння невядома –<br>З маладой сябрыны не дайду дадому. |
| Там вон встретил вербу, там сосну приметил,<br>Распевал им песни под метель о лете. | ____________, там сасну прыкмеціў,<br>Песню пад завею ім спяваў аб леце. |
| Сам себе казался я таким же клёном,<br>Только не опавшим, а вовсю зелёным. | ______________ я гэтакім жа клёнам,<br>Толькі не апалым, а, як май, зялёным. |
| И, утратив скромность, одуревши в доску,<br>Как жену чужую, обнимал берёзку. | Я свістаў, здурэлы, ветру наўздагонку,<br>Абдымаў бярозку, як чужую жонку. |
| **Сяргей Ясенін.** *«Клён ты мой апалы, клён заледзянелы...».* | Пераклад Рыгора Барадуліна |

**Уласныя версіі**

**2-і радок:** ______________________________________________

**9-ы радок:** ______________________________________________

**11-ы радок:** ______________________________________________